Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь
УА “Палескі дзяржаўны ўніверсітэт”

**М.В. Цуба**

# У ГАДЫ ВАЙНЫ ЯГО ЛЁС
# БЫЎ ЗВЯЗАНЫ З ПАЛЕССЕМ

ПолесГУ

Пінск
ПалесДУ
2018

УДК 930(476)
ББК 63.3(4Беи)
Ц83

Р э ц э н з е н т ы:
кандыдат педагагічных навук, Лазіцкі В.Л.;
кандыдат гістарычных навук, дацэнт Гагуа Р.Б.

Р э к а м е н д а в а н а
да друку навукова-метадычным саветам
УА "Палескі дзяржаўны ўнверсітэт"

**Цуба, М.В.**

Ц83 У гады вайны яго лёс быў звязаны з Палессем / М.В. Цуба. – Пінск : ПалесДУ, 2018. – 27 с.

ISBN 978-985-516-512-6

Аўтар: Цуба Міхаіл Віктаравіч – ураджэнец вёскі Навіна Хорастаўскага сельсавету, кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры гісторыка-культурнай спадчыны УА "Палескі дзяржаўны ўніверсітэт".

У кнізе апавядаецца пра жыццёвы лёс і рэлігійную дзейнасць на беларускіх землях ў гады Вялікай Айчыннай вайны вядомага польскага святара Францішка Кубша.

Разлічана на шырокае кола чытачоў.

УДК 930(476)
ББК 63.3(4Беи)

ISBN 978-985-516-512-6

© Палескі дзяржаўны ўніверсітэт, 2018

ПолесГУ

# ЗМЕСТ

УВОДЗІНЫ ........................................................................ 4
1. Францішак Кубш, яго святарскія абавязкі і місіянерская праца на Палессі напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны ........ 7
2. Шматгранная дзейнасць Ф. Кубша на землях беларускага Палесся і яго ўдзел у партызанскім руху ў складзе Пінскага партызанскага злучэння ........................................ 10
3. Грамадска-рэлігійныя і ваенныя справы Ф. Кубша на заключным этапе Вялікай Айчыннай вайны .......................... 20
ЗАКЛЮЧЭННЕ .................................................................. 24
СПІС ВЫКАРЫСТАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ .............................. 26

ПолесГУ

# УВОДЗІНЫ

Вялікая Айчынная вайна ўвайшла ў гісторыю Беларусі як геранчная бітва розных народаў супраць германскага нацызму не толькі на франтах ваенных дзеянняў, але і ў партызанскіх атрадах.

З часу вызвалення беларускіх земляў прайшло больш 70 гадоў, аднак не ўсе пытанні гісторыі вайны дастаткова распрацаваны ў гістарыяграфіі. Адным з іх з'яўляецца вывучэнне ўдзелу ў партызанскім руху Беларусі замежных прадстаўнікоў, у першую чаргу тых нацыянальнасцяў, якія не ўваходзілі ў склад СССР. Гэтае пытанне і па сённяшні дзень застаецца адной з "белых плям" айчыннай гісторыі. Даследаванні ў гэтым накірунку могуць прывесці да збліжэння народаў, паляпшэння іх культурных сувязяў, істотнай актывізацыі турызма і г.д.

Вывучэнне біяграфіі вядомых асоб, асвятленне абставін іхняга жыцця на беларускіх землях у лёсавызначальны перыяд Другой сусветнай вайны з'яўляецца адной з актуальных праблем і ў наш час. Абумоўлена гэта ўзрастаючым інтарэсам беларусаў да пазнання гісторыі свайго краю, да даследавання дзейнасці тых знакамітых людзей, шляхі якіх пралеглі праз нашу Радзіму. Адной з такіх асоб з'яўляецца славуты польскі святар Францішак Кубш.

Менавіта перыяд знаходжання Францішка Кубша на беларускіх землях, яго жыццядзейнасць на Палессі ў гады вайны фактычна зусім не даследаваны, і адсутнічаюць у беларускай літаратуры, і вельмі сціпла пададзены ў польскіх крыніцах.

У дадзенай працы мы паспрабуем сабраць разрозненыя, амаль невядомыя звесткі, не адлюстраваныя ў шматлікай польскай літаратуры, якія звязаны з жыццём і партызанскай дзейнасцю нацыянальнага героя Польшчы, легендарнага ксяндза Францішка Кубша на землях беларускага Палесся ў гады ваеннага ліхалецця. Дакладна гэты перыяд біяграфіі Кубша выпадае і амаль не адлюстроўваецца ў шматлікай польскай літаратуры, прысвечанай яму.



Полесгу

***Актуальнасць і выбар тэмы даследавання абумоўлены наступнымі высновамі.***

Актуальнасць праблемы вызначана неабходнасцю стварыць максімальна-аб’ектыўную карціну знаходжання, жыццядзейнасці і ўдзелу ў баявых аперацыях Францішка Кубша на Палессі падчас Другой сусветнай вайны. Гэта абумоўлена павышаннай цікавасцю жыхароў палескага краю да сваёй гістарычнай спадчыны, да тых людзей, якія лёсам былі звязаны з Палессем і ўпісалі слаўную старонку ў гераічную барацьбу разам з беларускім народам супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў і, тым самым, адыгралі канструктыўную ролю ў нашай гісторыі. Акрамя таго, такога разгляду патрабуюць працэсы станаўлення беларускай дзяржаўнасці і дэмакратычнага абнаўлення, якія маюць сёння месца ў нашай краіне. Менавіта гэтыя працэсы спарадзілі інтарэс да беларуска-польскіх адносін, культурных сувязяў, што можа пасадзейнічаць і прывесці да турыстычнай прывабнасці з боку грамадзян Польшчы да музея Партызанскай славы імя В.З. Каржа, а таксама да іншых мясцін, якія звязанны з прозвішчам Кубша на нашай палескай зямлі.

***Аб’ектамі даследавання*** з’яўляюцца найбольш цікавыя, невядомыя і малавядомыя старонкі жыцця, лячэбнай і баявой дзейнасці Францішка Кубша на Палессі ў перыяд Другой сусветнай вайны.

***Прадмет даследавання*** – жыццядзейнасць і лёс Францішка Кубша ў спалучэнні з ваеннымі ўмовамі той рэчаіснасці, у якой ён знаходзіўся ў палескім краі.

***Гіпотэза даследавання*** – здзяйсненні сваіх святарскіх абавязкаў ксяндзом Францішкам Кубша ў гады бязлітаснай ваеннай калатнечы на беларускім Палессі, яго рэлігійна-асветніцкія ўзаемаадносіны з людзьмі, ваенныя выпрабаванні, партызанская баявая і лячэбная дзейнасць. Улічваючы наспелую актуальнасць з аднаго боку, а з другога – слабую, недастатковую распрацаванасць аналізуемай тэматыкі, ***у працы пастаўлена наступная мэта:*** на аснове нешматлікіх літаратурных фактаў, перыёдыкі, архіўных і

ПолесГУ

дакументальных крыніц, расказаў людзей, якія тым ці іншым чынам былі звязаны з Францішкам Кубшам правесці комплекснае, рознабаковае, аб’ектыўнае даследаванне жыццядзейнасці славутага польскага святара на землях беларускага Палесся напярэдадні і падчас Вялікай Айчынай вайны.

Зыходзячы з мэты, вызначаны наступныя ***задачы даследавання:***

- высвятліць абставіны ў якіх аказаўся на беларускіх землях Францішак Кубш падчас сваёй місіянерскай працы, а таксама вызначыць яго грамадзянскую пазіцыю напарэдадні ваенных падзей;
- вывучыць жыццядзейнасць Францішка Кубша на Палессі, паказаць як ваенныя падзеі і непазбежныя страты паўплывалі на лёс польскага святара;
- прааналізаваць грамадска-рэлігійныя і ваенныя справы Францішка Кубша на заключнам этапе вайны.
- зрабіць усё магчымае для ўшанавання памяці аб польскім святары ў нашым краі.

Для рэалізацыі пастаўленных мэты і задач выкарыстаны наступныя ***метады даследавання***: праводзіўся метад аналізу і вывучэння літаратуры.

Прымяняўся параўнальна-гістарычны метад: занатаваныя запісы ўспамінаў аб Францішку Кубшу і расказы ведаючых яго вяскоўцаў параўноўваліся і ўдакладняліся ў ходзе абагульнення гістарычнай і філалагічнай літаратуры, перыядычнага друку, дакументальных матэрыялаў, архіўных дадзенных Нацыянальнага архіву Рэспублікі Беларусь (НАРБ), а таксама праводзілася фотаздымачная праца. Акрамя таго, у рабоце выкарыстаны матэрыялы, дакументы музея Партызанскай славы імя В.З. Каржа, што знаходзіцца ў вёсцы Хорастава.

***Навуковая навізна працы*** заключаецца ў тым, што дадзеная работа з’яўляецца самастойным даследаваннем невядомых і малавядомых старонак жыцця Францішка Кубша на Палессі напярэдадні і падчас Вялікай Айчыннай

вайны. У выніку атрыманы новыя дадзеныя, сфармуляваны вывады, якія ўтрымліваюць пэўную даследчую навізну, раскрываюць невядомыя факты, шмат у чым дапаўняюць і ў істотнай ступені мяняюць ранейшыя погляды на святарскія абавязкі, грамадска-лячэбную і баявую дзейнасць Францішка Кубша падчас яго знаходжання на палескай зямлі.

***Практычная значнасць*** працы заключаецца ў тым, што высновы і новыя факты могуць быць выкарыстаны пры афармленні экспазіцыі ў музеі Партызанскай славы імя В.З. Каржа, бібліятэках, школьных музеях, пры правядзенні мерапрыемстваў культурна-патрыятычнага характару.

## 1. Францішак Кубш, яго святарскія абавязкі і місіянерская праца на Палессі напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны

На тэрыторыі Хорастаўскага сельсавета (уваходзіў у былую Пінскую вобл.) ў гады Вялікай Айчыннай вайны адбыліся падзеі, якія адыгралі вялікую ролю ў гісторыі партызанскага руху Беларусі. Ураджэнцам вёскі Хорастава В.З. Каржом быў створаны першы на тэрыторыі СССР і адпаведна на Беларусі партызанскі атрад. У гэтым атрадзе мужна змагаліся будучыя героі – В.З. Харужая, А.Я. Кляшчоў, а таксама яшчэ адзін вядомы прадстаўнік вёскі Хорастава – Р.С. Карасёў, адзін з арганізатараў партызанскага руху на Піншчыне, імя якога носяць вуліцы ў Пінску і Лунінцы. Жыхарамі Хорастаўскага сельсавета з'яўляліся браты-патрыёты Міхаіл і Іван Цубы з вёскі Навіна.

На тэрыторыі сельсавета размяшчаліся штаб Пінскага партызанскага злучэння, аэрадром, шпіталь, друкарня газеты "Палеская праўда". На часовай дыслакацыі ў 1942 і 1943 гг. тут знаходзілася злучэнне партызан Украіны на чале са знакамітым С.А. Каўпаком.

Добра вядома на палескай зямлі і славутая асоба легендарнага польскага патрыёта ксяндза Францішка Кубша. Нягледзячы на тое, што яго дзейнасць у Хорастаўскім краі ў



ПолесГУ

савецкі час увогуле не атрымала агалоскі і, па сутнасці, была асуджана на забыццё, нават сёння тыя, каму ўжо за 80 гадоў у вёсках Хорастава, Чаланцы, Пузічах, Рахавічах, Вейна, Навіне, Груздаве і інш. адразу пазнаюць фотаздымак ксяндза Кубша. Некаторыя з іх – дабаўляючы: “Як жа яго не помніць, калі ён мяне і шматлікіх тагачасных дзяцей выратаваў ад смерці”. Слухаючы вяскоўцаў, ахоплівае здзіўленне: гэта ж якую патрэбна было разгарнуць дзейнасць ў цэлым рэгіёне ў час вайны, каб цябе настолькі помнілі і цанілі.

Дык адкуль і кім жа быў гэты “Вялікі чалавек”, як яго называюць сёння некаторыя палешукі Хорастаўшчыны і чаму ён назаўсёды застаўся ў іх сэрцах і памяці.

Вільгельм-Францішак Карлавіч Кубш нарадзіўся 29 сакавіка 1911 г. ў сям’і польскага машыніста паравоза ў невялікім гарадку Гляйвіц, што знаходзіўся на памежжы Германіі і Польшчы. Гарадок, дзе пражывала як нямецкае, так і польскае насельніцтва, 31 жніўня 1939 г. стаў вядомым на ўвесь свет у сувязі з правакацыйнай германскай аперацыяй “Кансервы”, пасля якой першага верасня 1939 г. распачалася Другая сусветная вайна. Менавіта адсюль пачала ажыццяўляцца нямецкая праграма генацыду палякаў, а затым іншых славянскіх народаў. Няма сумненняў, што Францішак Кубш добра ведаў звярыную сутнасць германскага нацызму і ўсёй душой узненавідзеў яго чалавеканенавісніцкую ідэалогію.

Да гэтага часу Кубш атрымаў выдатную ўсебаковую адукацыю. Ён вучыўся ў духоўнай семінарыі аблатаў у Люблінцы, адначасова атрымаў медыцынскую прафесію стаматолага, затым скончыў навіцыят ордэна аблатаў-місіянераў Беззаганнай Панны Марыі у Маркавіцах. Пасля пасвяшчэння ў сан святара Кубш амаль тры гады працаваў эканомам духоўнай семінарыі ў горадзе Обр. [1]. Аблаты вельмі грунтоўна рыхтавалі сваіх выхаванцаў да складанай місіянерскай дзейнасці. Але лёс наканаваў Ф. Кубшу такія іспыты, якія ў істотнай ступені немагчыма было прадугледзець. Яго місіянерская дзейнасць пачалася ў жніўні 1939 г. ў палескай вёсцы Лунін, што непадалёк ад Лунінца.

Полесгу

Тут ён займаў пасаду вікарыя парафіі касцёла Прэабражэння Госпадняга [9].

У хуткім часе Кубш пазнаеміўся з ксёндзамі-беларусамі, з суседніх вёсак і горада Лунінца, якія вялі набажэнствы на беларускай мове. І ўжо праз пару тыдняў у касцёле Лунінца загучала падчас набажэнства беларуская мова.

Вельмі цяжкае становішча ў раёнах Заходняй Беларусі склалася з навучэннем дзяцей, увогуле была істотнай непісьменнасць насельніцтва. Беларускія школы амаль адсутнічалі, а польскіх не хапала, каб забяспечыць навучанне ўсіх дзяцей. У выніку на верасень 1939 г. на заходніх беларускіх землях 129,8 тыс. дзяцей школьнага ўзросту аказаліся па-за межамі адукацыі [2]. Такія абставіны не засталіся без увагі лунінскага вікарыя і пры касцёле Праабражэння Госпадняга запрацавала для дзяцей прыхажан і ўсіх жадаючых невялікая школка з бібліятэкай .

Па ўспамінах прыхажан ён вельмі перажываў напад Германіі на Польшчу (1 верасня 1939), прадбачліва гаварыў людзям, што Германія пойдзе далей і не абмяжуецца толькі захопам Польшчы. На канкрэтных прыкладах Францішак Кубш растлумачваў мясцовым палешукам як ненавісны вораг зняважыў і растаптаў усе рэлігійныя святыні, свяшчэнныя прынцыпы і нормы хрысціянскай маралі на польскай зямлі. У сувязі з германскім наступленнем на пачатку верасня 1939 г. вялікая колькасць польскіх бежанцаў хлынула ў Заходнюю Беларусь. Надзейным прытулкам для гэтых бяздомных людзей на беларускіх землях з'яўляліся каталіцкія касцёлы. Па ўспамінах жыхароў вескі Лунін, шматлікіх польскіх бежанцаў, якія аказаліся ў дадзенай весцы, лунінскі вікарый засяляў у падсобках касцела, уладкоўваў да сваіх прыхажан, падбадзёрваў, паднімаў настрой у тых, хто зусім паў духам.

Акрамя пастырскіх абавязкаў, вельмі спатрэбіліся і дапамаглі Ф. Кубшу добрыя веды ў лячэбнай справе, асабліва ў стаматалогіі, своечасовае аказанне медыцынскай дапамогі ўсім тым, хто ў ей меў патрэбу, пасадзейнічала набыццю аўтарытэта і павагі Ф. Кубшу сярод мясцовага беларускага і аселага польскага насельніцтва.

ПолесГУ

17 верасня 1939 г. войскі Чырвонай Арміі перайшлі граніцу польскай дзяржавы і пачалі паход у Заходнюю Беларусь. 19 верасня быў вызвалены Лунінец, а 20–21 верасня ўся Піншчына. Адбылася змена ўлады. На тэрыторыі Заходняй Беларусі бальшавіцкімі ўладамі распачаліся рэпрэсіі і дэпартацыя польскага насельніцтва, істотна зменьшылася колькасць католікаў. Аднак у Луніне Францішку Кубшу удалося знайсці паразуменне з новымі ўладамі.

І хаця ва ўмовах “ваяўнічага атэізму” не проста было з’яднаць вакол сябе паству, тым не менш з гэтай задачай малады святар добра справіўся, яго парафія колькасна павялічылася.

## 2. Шматгранная дзейнасць Ф. Кубша на землях беларускага Палесся і яго ўдзел у партызанскім руху ў складзе Пінскага партызанскага злучэння

22 чэрвеня 1941 г. пачалася Вялікая Айчынная вайна. Ужо на пачатку вайны Лунінеччына аказалася захопленай германскімі войскамі. Дасканала ведаючаму нямецкую мову ксяндзу фашысты прапанавалі ўвайсці ў склад прыбліжаных да захопнікаў людзей “фольксдойчэ”, а пасля яго катэгарычнага адказу ўстанавілі слежку. Дэкан ксёндз касцёла Святога Юзэфа ў Лунінцы С. Пачубут-Адланіцкі, ведаючы прамату выказванняў і лютую нянавісць Ф. Кубша да нацыстаў, перавёў яго ў Лунінецкі касцёл, але тут навісла пагроза арышту. Тады, каб выратаваць ад пераследу гестапа і зберагчы маладога і гарачага святара, было вырашана накіраваць яго ў найбольш глухое месца, настаяцелем касцёла Святой Ганны ў в. Пузічы (дадзеная вёска знаходзіцца ў 5 км ад Хорастава, зараз Салігорскі р-н) [3, с. 37].

ПолесГУ



*Былы настаяцель касцёла Святой Ганны ў Пузічах, адважны партызан і лекар Пінскага партызанскага злучэння, генеральны дэкан Войска Польскага палкоўнік Францішак Кубш*

Менавіта тут ў маладога настаяцеля ў поўнай ступені праявіліся ўнікальныя здольнасці: чулыя, спагадлівыя адносіны да людзей, тонкае адчуванне разнастайных жыццёвых абставін, патрыятызм, перакананасць у правільнасці Богам дадзенага жыццёвага шляху. Ксёндз Кубш заўсёды знаходзіў самую актуальную і цікавую тэматыку для размовы з вяскоўцамі, ніколі не падзяляючы іх па рэлігійнаму веравызнанню і не схіляючы да пераходу ў каталіцкую канфесію. Нават самыя аўтарытэтныя мясцовыя жыхары здзіўляліся і не маглі зразумець, адкуль такі шырокі кругазор ведаў у трыдцацігадовага хлопца. Па ўспамінах пузічан ксёндз выдатна разбіраўся ў агранаміі, ветырынарыі і, асабліва, ў медыцыне, што дазваляла яму дапамагаць і даваць неабходныя парады мясцовым вяскоўцам. Ён ведаў рэцэпты з розных травяных настояў, якія эфектыўна дапамагалі ў барацьбе са шкоднымі насякомымі ў садзе і агародзе, раіў, якім чынам палепшыць севазварот на бедных пясчаных кавалках зямлі.

Але галоўным заняткам Ф. Кубша разам з рэлігійнымі абавязкамі была медыцына. Фактычна, на ўсю Хорастаўшчыну ён з’яўляўся адзіным лекарам. У хуткім часе аб яго добрых медыцынскіх здольнасцях ведалі ва ўсіх

ПолесГУ

навакольных вёсках. Прыходзілася наведваць цяжка хворых на месцы жыхарства, іншых прывозілі на лячэнне непасрэдна да яго. Вельмі шмат было хворых дзяцей, а самай распаўсюджанай хваробай быў тыф. Ксёндз Кубш толькі яму вядомымі спосабамі, а таксама дзякуючы настоям з загадзя падрыхтаваных лекавых траў, змог вылечыць вялікую колькасць мясцовых дзяцей. Але падчас лячэння і проста ў бяседах з мясцовым людам Францішак Кубш ніколі не забываў расказаць аб сапраўднай сутнасці нямецкага фашызму. Галоўнай мэтай ксёндза было перасцерагчы мясцовых людзей ад супрацоўніцтва з акупантамі. І тое, што фашысты так і не змаглі стварыць ні адзінага паліцэйскага ўчастку на Хорастаўшчыне, а вымушаны былі забіраць асобных сваіх “памагатых” у райцэнтры, дзе дыслацыраваўся іх гарнізоны, бясспрэчная заслуга ксёндза Кубша.

З’яўляючыся з верасня 1941 г. настаяцелем прыхода ў Пузічах, Ф. Кубш у той жа час, па даручэнню ксяндза-дэкана Пачобута-Адланіцкага, заставаўся кіраўніком прыхода ў Лунінцы. А гэта азначала, што адзін раз у тыдзень ён абавязкова павінен быў наведвацца ў райцэнтр і весці там набажэнства. Па шляху з Пузіч да Лунінца рабіў астаноўкі ў розных населеных пунктах, знаёміўся і наводзіў сяброўскія сувязі і добрыя ўзаемаадносіны не толькі з каталіцкімі, але і з праваслаўнымі святарамі. Працуючы на вялізнай тэрыторыі і знаходзячыся ў курсе ўсіх падзей, ён добра ўсведамляў існуючую рэальнасць, бачыў, як паступова ўмацоўваецца і набывае размах партызанскі рух. Ідэі гэтага руху Кубш вельмі добра разумеў і сам заахвочваў насельніцтва да барацьбы супраць нямецкіх акупантаў.

З пачаткам кампаніі акупацыйных улад па вывазу моладзі на прымусовыя работы ў Германію ксёндз наведаў амаль усе навакольныя вёскі і на канкрэтных прыкладах і фактах расказаў маладым людзям, што іх чакае ў Нямеччыне [4, с. 209]. У выніку адбыўся массавы збег моладзі ў партызанскі атрад “Камарова” (В.З. Каржа), які прыбыў з Пінска і дзейнічаў на Хорастаўшчыне.

ПолесГУ

Выявіць зачыншчыка “беспарадкаў” і “сарваных планаў” фашыстам дапамог мясцовы здраднік. У студзені 1942 г. Францішак Кубш быў арыштаваны і кінуты ў засценкі гестапаўскай турмы ў Ганцавічах. Пасля пакутлівых допытаў ксёндзу Кубшу быў вынесены вердыкт “вельмі небяспечны вораг Германіі” і ён быў вывезены для далейшых допытаў і ліквідавання ў расстрэльную турму, што знаходзілася ў Баранавічах. Толькі глыбокія веды чалавечай псіхалогіі і бліскучае ўменне знайсці кантакт з любым суразмоўнікам спаслі яго ад немінуючай смерці. Дасканала ведаючы нямецкую мову, Кубш змог увайсці ў давер да турэмнага наглядчыка-аўстрыйца, які аказаўся веруючым каталікам. Пасля чарговага адказу выдаць свае сувязі з партызанамі, прозвішча ксёндза было ўнесена ў расстрэльны спісак. Падчас расстрэлу групы іншых сакамернікаў Францішка Кубша, наглядчык выкрэсліў са спіска прозвішча ксёндза, як ужо расстралянага, і адпусціў яго на свабоду [5]. Дабраўшыся да Пузіч, Францішак Кубш разумеў, што ў гэтых абставінах застаецца толькі адзін выхад – бязлітаснае знішчэнне ворага са зброяй у руках. Такім чынам, з дапамогай свайго прыслужніка па касцёлу Антона Ясюкевіча, ксёндз Кубш у хуткім часе становіцца партызанам атрада Васільева “Дзядзі Васі”, які пазней быў пераўтвораны ў складзе Пінскага партызанскага злучэння ў вядомую партызанскую брыгаду імя Леніна. Дыслацыраваўся атрад у самым цэнтры парафіі ксёндза паміж вескамі Пузічы і Вейна.

Аб гэтым перыядзе свайго жыцця Ф. Кубш успамінае так: “Атрад наш знаходзіўся на тэрыторыі маёй абшчыны Пузічы, у грычынскіх балотах, акружаных лясамі. У той час, калі гітлераўцы наступалі на Сталінград, я дзяліў свой лёс з бяздомнымі палескімі партызанамі. Шэрагі іх хутка раслі. Але ўзнікла праблема недахопу зброі. З мэтай яе здабычы рабіліся засады на немцаў, якія ехалі ў адзіночку. Выконваліся напады на паліцэйскія ўчасткі і патрулі нямецкай жандармерыі. Амаль штотыдзень, а бывала і часцей, наш атрад мініраваў і падрываў на чыгунцы вайсковыя эшалоны. Аднойчы пры такой дыверсіі спыніўся



Полесгу

ахоплены полымем вайсковы эшалон з бензінам, які рухаўся на фронт. Гэта адбылося на станцыі Сінкевічы. У выніку па дадзенай чыгунцы некалькі дзён у бок фронту не мог праехаць ні адзін цягнік. Іншым разам паступіла паведамленне, што праз наш адрэзак чыгункі пройдзе эшалон са зброяй, які ахоўваецца невялікай колькасцю салдат. Тады нашы партызаны ўзарвалі рэйкі, атакавалі гэты цягнік і цалкам захапілі яго. Гітлераўцы развіталіся з гэтым светам, а партызаны істотна ўзбагаціліся боепрыпасамі, аўтаматамі і кулямётамі. Але не кожная дыверсія на чыгунцы завяршалася поўным поспехам. Часам і нашы не вярталіся ў лагер – былі забітыя і параненыя” [10, с. 127].

А як толькі ў маі 1942 г. трывала замацаваліся межы партызанскай зоны па рэках Морач, Случ і Лань, у Пузічах зноў запрацаваў касцёл Святой Ганны.

Ведаючы грунтоўныя і так неабходныя для партызан лекарскія здольнасці ксёндза Ф.В. Кубша, камандзір Пінскага партызанскага злучэння В.З. Корж забараніў яму непасрэдна ўдзельнічаць у баявых аперацыях. Аднак той, валодаючы бясспрэчным дарам уваходзіць у цёплыя дабразычлівыя адносіны з людзьмі і маючы выдатныя арганізатарскія здольнасці, змог сабраць у складе злучэння польскую роту з мясцовых католікаў. А затым гэтая рота, дзякуючы руплівым стараннямі Францішка Кубша, перарасла ў складзе злучэння ў польскі партызанскі атрад імя Касцюшкі пад камандаваннем яшчэ аднаго польскага патрыёта Чэслава Кліма [4, с. 212].

Шмат каштоўных звестак было атрымана начальнікам разведкі Пінскага партызанскага злучэння Гаўрылам Сцешыцам аб руху цягнікоў, колькасці пастоў, іх распалажэнню на чыгуначных станцыях Сінкевічы і Мікашэвічы для нанясення затым паспяховых дыверсійных удараў па ворагу. І тут не абышлося без удзелу Францішка Кубша. Добра ведаючы па ранейшай працы ў Луніне і Лунінцы ксяндзоў, мясцовых на Луніненчыне касцёлаў, ён заагітаваў іх стаць інфарматарамі партызан [11, с. 7].

Зімой 1942–1943 гг. партызанская зона істотна пашырылася, а ўдары па ворагу мацнелі з дня на дзень. Каб

расквітацца з партызанскім рухам і мясцовым насельніцтвам за свае вялікія страты фашысцкае камандаванне зняла з фронту шматлікія вайсковыя фарміраванні.У выніку, падчас аперацыі “Горнунг” супраць партызан і мірных жыхароў, што знаходзіліся ў Хорастаўскім рэгіёне, было задзейнічана каля дваццаці тысяч салдат і афіцэраў. У ходзе аперацыі фашысты знішчылі трэцюю частку мірнага насельніцтва ў Хорастаўскім краі, спалілі дашчэнту ўсе вёскі [6, с. 31, 46].

У цяжкіх і няраўных баях, што распачаліся з 10 лютага 1943 г. Пінскае злучэнне пад камандаваннем В.З. Каржа несла вялікія страты. Загінула падчас бою і доктар злучэння Вольга Чачуліна. А ўсе абавязкі па лячэнню і дагляду за параненымі ляглі на плечы Францішка Кубша [11, с.7].

У гэтых абставінах вельмі часта выручалі кемлівасць і незвычайныя вынаходніцтвы ксяндза. Любая тканіна, бялізна, ручнікі выкарыстоўваліся для перавязкі. Не маючы ніякіх антысептыкаў і спірта для апрацоўкі ран Кубш для гэтага прымяняў мачавіну. Перад перавязкай цяжка-параненых па яго загаду дапамагаючыя ксяндзу партызаны задымлівалі, прыпякалі рану, а затым прысыпалі яе табачным попелам. Такія вынаходніцтвы былі вельмі эфектыўнымі і, па меркаванню сённяшніх партызан-ветэранаў, спаслі ў той час многіх параненых ад гангрэны і пакутлівай смерці без належнай медыцынскай дапамогі.

Але не толькі медыцынскімі справамі абмяжоўвалася партызанская дзейнасць Кубша. Вядомы факт, што ноччу 6 сакавіка 1943 г. менавіта ён падчас прарыву блакады першым з аўтаматам у руках падняў у атаку атрад “Дзядзі Васі” і, нягледзячы на моцны кулямётны агонь праціўніка, партызаны змаглі прарваць кальцо блакады. А затым яшчэ некалькі гадзін збітыя з толку фашысцкія вайскавыя фарміраванні ваявалі адзін супраць другога. Гэта і дазволіла партызанскаму злучэнню адарвацца ад пераследу, а затым вярнуцца на пастаяннае месца дыслакацыі.

Аб гэтых падзеях у дзённіку Ф. Кубша занатаваны наступныя радкі: “Ніколі не забуду зіму, праведзенную ў партызанскім атрадзе. Улетку можна было без асаблівых

цяжкасцяў схадзіць на “заданне”. Узімку кожны крок пакідаў за сабой след,а гэта было небяспечна. Жыллём нам служылі “зямлянкі”. Агонь, улічваючы пастаянна дзеючую нямецкую авіяцыю, распальваць было нельга. Калі ў лютым 1943 мы апынуліся ў акружэнні, і немцы сістэматычна нас абстрэльвалі артылерыяй і авіяцыяй, трэба было мець звышчалавечыя сілы, каб супрацьстаяць абставінам… Мы цэлымі суткамі блукалі па грычынскіх балотах, каб выслізнуць з фашысцкага кальца. Паўсюдна мініравалі дарогі, а часам рабілі выгляд, што мініруем, проста расцягвалі вяроўкі і ніткі, а іншы раз ставілі невялікія пасткі на пешаходаў. Гітлераўцы панічна пужаліся мін, а пагэтаму баяліся ўваходзіць у лес. Прыкладна праз тыдні тры безупынных баёў нам удалося вырвацца з акружэння” [10, с. 129]. Па ўспамінах Ф.Кубша, ад відавочцаў ён даведаўся аб масавым знішчэнні фашысцкімі карнікамі жыхароў Хорастава і навакольных вёсак. Аб гэтым сведчыць яго запіс: “Мужчын, жанчын і дзяцей загналі на вялікі сядзібны двор. Людзі плакалі, дзеці крычалі, многія малілі аб дараванні ім жыцця дзеля ўсяго святога. Праваслаўны святар, калі ўбачыў, што немцы, наставіўшы кулямёты, заганяюць ўсіх у хлявы заклікаў усіх супакоіцца і папрасіў дазволу сказаць некалькі слоў. Звяртаючыся да ўсіх прысутных, ён прапанаваў усім падрыхтавацца да сустрэчы з Усявышнім. Разбудіў словамі смутак за грахі, якія былі зроблены, і даў адпушчэнне грахоў. Як толькі загучала малітва, адбыўся падпал і распачалася кулямётная стральба. Загінуў сумленны “бацюшка” разам са сваёй сям’ёй, загінулі яго і мае прыхажане.

З тымі католікамі і праваслаўнымі, якія цудам засталіся ў жывых, я займаўся ў нядзелю і на святы. Я абышоў з імі амаль усе месцы, якія былі асвечаны мучаніцкай крывёю нашых непрыкметных герояў, асвечваючы іх магілы і месцы, дзе яны прынялі сваю смерць… У гэты час трыумфаў прынцып узорнага суіснавання і супрацоўніцтва людзей розных веравызнанняў і светапоглядаў, але салідарных у барацьбе са злом, з агульным ворагам” [10, с. 130]. Штаб Пінскага партызанскага злучэння з сярэдзіны сакавіка 1943 г.



Полесгу

і да вызвалення – ліпень 1944 г. знаходзіўся на хутары Закрывая паблізу вёскі Навіна. Тут жа ў трохстах метрах ад штаба запрацаваў партызанскі шпіталь, куды і быў тэрмінова пераведзены для выканання сваіх медыцынскіх абавязкаў Францішак Кубш.

Дзякуючы сваёй эрудыцыі, медыцынскім ведам, выключнай прыстойнасці ксёндз Кубш стаў адным з лепшых сяброў камандзіра Пінскага партызанскага злучэння В.З. Каржа і ўлюбёнцам партызан. Усе яго называлі нязвыклым для савецкіх партызан словам "пан", але з абавязковай паважлівай прыстаўкай "наш".

Вяртаючыся з баявых заданняў шматлікія партызанскія групы часта прыводзілі палонных нямецкіх салдат і афіцэраў. Улічваючы тое, што пры штабе толькі адзін чалавек дасканала ведаў нямецкую мову, В.З. Корж вымушаны быў задзейнічаць у допытах "языкоў" ксендза Кубша. Добра ведаючы чалавечую душу, норавы, псіхалогію, ён і тут праявіў сябе найлепшым чынам. Без усялякіх фізічных уздзеянняў мог выведаць самыя карысныя і неабходныя звесткі для партызан, якія тэрмінова перадаваліся па рацыі на вялікую зямлю ў Беларускі Штаб Партызанскага Руху (БШПР). Па сведчанню былых партызан, падчас допыту аднаго з нямецкіх афіцэраў Кубш выказаў думку, што "пасля разгромнага паражэння пад Сталінградам, Германія ў хуткім часе вайну прайграе". На гэта палонны афіцэр у запале спрэчкі адрэагаваў вельмі востра, сказаўшы, што Гітлер рыхтуе такі магутны ўдар летам 1943 г. пад Курскам, пасля якога савецкія войскі будуць канчаткова разгромлены. Менавіта гэтая інфармацыя як і іншыя крыніцы, якія пацвердзілі яе, пераканалі савецкае кіраўніцтва аб нямецкім наступленні на Курскім выступе. А затым прынятыя загадзя меры прывялі да карэннага пералому ў ходзе ўсёй вайны.

Але час быў няпросты. На тэрыторыі Заходняй Беларусі дзейнічалі антысавецкія польскія ўзброенныя фарміраванні (у асноўным, Армія Краёва), якія ў адпаведнасці з палітычнымі ўстаноўкамі польскага эміграцкага ўрада ў Лондане рабілі



Полесгу

стаўку на неабходнасць вяртання “ўсходніх крэсаў” у склад Польшчы.

Менавіта ў гэты час на большай часцы Заходняй Беларусі быў створаны абшар № 2 “Беласток”, які ўзначальваў палкоўнік Е. Гадлеўскі. Абшар уключаў Беластоцкую, Віленскую, Навагрудскую і Палескую акругі. Пасля таго як у ліпені 1941 г. быў падпісаны дагавор аб аднаўленні дыпламатычных адносін польскім эмігранцкім урадам з СССР, на Палессі было праведзена некалькі сумесных баявых аперацый польскіх і савецкіх партызан супраць германскіх акупацыйных войск. Але хутка германскія ўлады абнародавалі звесткі аб расстрэле савецкімі нкусаўцамі (НКУС – народны камісарыят унутранных спраў) вясной 1940 г. ў Катынскім лесе 25 тысяч польскіх афіцэраў, журналістаў, урачоў, адвакатаў, выкладчыкаў, святароў (капеланаў). Прыкрыць злачынства “вывадамі” створанай на пачатку 1943 г. спецыяльнай камісіі на чале з Н. Бурдэнка, якая быццам бы знайшла ў растрэлах “нямецкі почырк”, сталінскаму кіраўніцтву не ўдалося. У выніку Армія Краёва канчаткова перайшла да тэорыі “двух ворагаў” – Германіі і СССР і аднаўлення Польскай дзяржавы ў межах 1939 г.

З вясны 1943 г. распачынаецца бязлітасная барацьба Арміі Краёвай з савецкімі партызанамі. Вядома, што толькі атрадамі акаўцаў з Навагрудскай і Палескай акруг была праведзена 81 аперацыя супраць савецкіх партызан [8].

У штаб Пінскага партызанскага злучэння з Масквы было накіравана некалькі нкусаўцаў для вывучэння польскага пытання на Палессі. У выніку ў поле іх зроку папалі Францішак Кубш, некалькі партызан з атрада імя Т. Касцюшкі ды шэсць сем’яў былых польскіх настаўнікаў, якія падчас блакады хаваліся ад нямецкіх карнікаў разам з сем’ямі мясцовых паляшукоў і разам з імі жылі ў лясных зямлянках. Аргументаваныя довады Каржа, што ўся “антысавецкая” дзейнасць гэтых людзей зводзіцца ўсяго да малення падчас каталіцкіх святаў і спеваў польскіх песняў, не пераканала візіцёраў з Масквы. Тады Корж вымушаны быў выклікаць Ф. Кубша ў штаб, дзе той упэўнена зазначыў, што



ПолесГУ

аб межах будучай Польшчы ніякіх размоў не было, у гэтым пасля вайны разбяруцца ўрады, а нам патрэбна разам ваяваць, каб хутчэй перамагчы Германію.

І хаця прадстаўнікі НКУС усюды бачылі загавар і стварэнне падпольнай антысавецкай польскай групоўкі, яны часова адступілі. Але В.З Корж разумеў, што ў гэтай сітуацыі ксяндза патрэбна нейкім чынам выратаваць.

У красавіку 1943 г. штаб Пінскага партызанскага злучэння наведалі ўпаўнаважаныя прадстаўнікі БШПР К.Т. Мазураў і М.В. Зімянін. Камандзір злучэння В.З. Корж, а таксама камсамольскі важак Э.Б. Нордман падрабязна расказалі ім аб партызанскай дзейнасці адважнага польскага святара. Па мяркаванню палкоўніка ў адстаўцы, аўтара кнігі “Больно даже мёртвым” А.Ф. Ясько, менавіта з падачы ўпаўнаважаных БШПР аб вядомым на Палессі каталіцкім святары даведалася славутая польская пісьменніца, ў той перыяд супрацоўніца Галоўнага палітычнага ўпраўлення Чырвонай Арміі – Ванда Васілеўская. Якраз яна, а таксама польскія генералы Зігмунд Берлінг і Караль Свірчэўскі ў гэты час займаліся на тэрыторыі СССР фарміраваннем першай польскай арміі, адначасова падбіраючы кемлівых аднадумцаў для стварэння органаў кіраўніцтва будучай вызваленай Польшчы – Нацыянальнага Камітэта Свабоднай Польшчы (НКСП) [4, с. 220].

У хуткім часе Вярхоўнаму Галоўнакамандуючаму І.В. Сталіну быў прадстаўлены для зацвярджэння спісак будучага складу НКСП, дзе таксама былі акрэслены пасады кожнага ў спісе на перыяд вайны. Сярод 16 чалавек, увайшоўшых ў дадзены дакумент, агульнавядомыя польскія военачальнікі, вучоныя, грамадскія дзеячы. Пад № 9 ў гэтым спіску пазначана “Ксёндз, капелан першага польскага корпуса Кубш Францішак” [4, с. 221].

Пад канец мая 1943 г., па асабістаму загаду І.В. Сталіна, за партызанскім лекарам з Масквы быў накіраваны самалет. Па ўспамінах мясцовых жыхароў, усё, што паспеў зрабіць перад адлётам Францішак Кубш, гэта ажыццявіць абрад хрышчэння ўсіх прыведзеных бацькамі да яго дзяцей,

ПолесГУ

прычым як католікаў, так і праваслаўных [9, с. 4]. Пакідаючы беларускую зямлю, ў сваім дзённіку ён запіша наступнае: “Шкада мне была пакідаць Палессе, якое я так палюбіў, дзе столькі перажыў, але і дзе сустрэў столькі добрых і спагадлівых людзей” [10, с.70].

## 3. Грамадска-рэлігійныя і ваенныя справы Ф. Кубша на заключным этапе Вялікай Айчыннай вайны

Менавіта з ўваходжання ў склад НКСП пачынаецца сусветная знакамітасць ксёндза Францішка Кубшы. Ён прымае актыўны ўдзел на Усеславянскім з’ездзе ў Маскве. Выступаючы з дакладам ў Калонным зале Дома Саюзаў Ф.В. Кубш публічна заклеймаваў ганьбай нацысцкіх забойцаў. З яго слоў, непасрэднага відавочцы трагічных падзей аперацыі “Горнунг”, весь свет даведаўся аб масавым знішчэнні гітлераўскімі варварамі жыхароў вёсак Хорастаўскага рэгіёну, узарванні касцёла Святой Ганны ў Пузічах, зажыва спаленых прыхажанах у Хорастаўскай Пакроўскай царкве, разам з бацюшкай Іаанам.



*Францішак Кубш прымае прысягу у генерала Зігмунда Берлінга (1943 год)*

Пры непасрэдным удзеле Ф. Кубшы ствараецца ў асноўным з дэпартаваных католікаў першая польская дывізія імя Т. Касцюшкі. Затым батальён імя Эміліі Плятэр з дэпартаваных дзяўчат. Берлінг аб дадзеным жаночым батальёне піша так: “Гэта было зроблена не для ваенных

патрэб, а з жадання дапамагчы дзяўчатам больш ніколі не вярнуцца ў гулаг". У яго ўспамінах зазначаецца, што гэта не былі чыста польскамоўныя фарміраванні, бо тут было шмат прадстаўнікоў з Заходняй Беларусі. У будучым знакамітая польская актрыса з Катавіцы Сабіна Храмінская-Лесняк, якая ваявала ў батальёне імя Э. Плятэр, успамінаючы Ф. Кубша, заўсёды плакала і прамаўляла: "Як мы яго любілі! Як мы яму верылі. Абяцаў нам, што мы вернемся ў Польшчу і ні адзін з нас не сумняваўся, што можа быць па-іншаму" [3, с. 131].

Першым баявым хрышчэннем для польскіх войскаў былі баі пад мястэчкам Леніна ( Магілёўская вобл., Гарэцкі р-н). Сам Ф. Кубш аб гэтым піша так: "Прыйшоў дзень 12 кастрычніка (1943 г.), які навечна застанецца ў гісторыі Войска Польскага. Пайшлі на ворага, як ураган, прарываліся наперад, раз за разам падаючы на зямлю. Быў я тады разам з усімі, благаслаўіў на барацьбу, успакайваў паміраючых, знакам крыжа паказваў адным шлях да свабоды, другім – да ўваскрашэння. Менавіта з Леніна у мяне звязаны самыя глыбокія перажыванні часоў мінулай вайны" [12, с.68,69].



*Ф. Кубш(чацверты справа) падчас святкавання 25-годдзя баёў пад Леніна. (Леніна, 1968 год)*

У 1944–1945 гг. Францішак Кубш у складзе Войска Польскага прымаў удзел спачатку ў вызваленні ад ворагаў беларускіх земляў, а затым сваей Айчыны – Польшчы. Вядома, што на франтавых шляхах ён не раз удзельнічаў у рызыкоўных баявых аперацыях, паказваючы прыклад асабістай адвагі, мужнасці і гераізму.

Францішак Кубш скончыў вайну ў вайсковым званні палкоўніка, на пасадзе генеральнага дэкана Войска

Польскага. Яго баявы шлях адзначаны шматлікімі ўзнагародамі СССР, а таксама ардэнамі і медалямі Польскай Рэспублікі, у тым ліку вышэйшай баявой узнагародай Польшчы – ордэнам Віртуці Мілітары.

У 50–70 гг. ХХ ст. ксёндз Кубш з’яўляўся вядомым рэлігійным і грамадскім дзеячам Польшчы. Памёр Францішах Кубш 27 ліпеня 1978 г., яго пахавалі на могілках у г. Ялёна Гура. Імем Кубша названы вуліцы ў польскіх гарадах Ялёна Гура, Вроцлаў, Катавіцы, у апошнім заснаваны музей, прысвечаны славутаму польскаму ксяндзу [ 7, с.167].




*Мемарыяльная дошка, усталяваная ў горадзе Катавіцэ ў Польшчы ў гонар стагоддзя з дня нараджэння Францішка Кубша на вуліцы, якая носіць яго імя*

У сваю чаргу, наш родны палескі край і яго жыхары ўдзячны лёсу, што ў самыя трагічныя часы выеннага ліхалецця гэты Чалавек з вялікай літары знаходзіўся разам з імі. Нягледзячы на злачынствы, масавыя забойствы, учыненыя нацыстамі і іх памагатымі , ён захаваў святую веру ў людзей, сам актыўна змагаўся з акупантамі, самаахвярна дапамагаў людзям, усяляў надзею і веру ў лепшае. Палешукі адказвалі яму ўзаемнасцю.

У плане падрыхтоўкі святкавання 70 гадавіны вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і Перамогі савецкага народа у Вялікай Айчыннай вайне, указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 20.05.2013 № 230 п. 10, пазначаецца, што неабходна “…актывізаваць архіўна-даследчыцкую працу па ўстанаўленню імёнаў, лёсаў і месц

пахаванняў загінуўшых у гады Вялікай Айчыннай вайны, адкрываць новыя памятныя месцы, ствараць мемарыяльныя зоны”.

Жыхары Хорастаўшчыны, жадаючы увекавечыць добрыя справы знакамітага польскага патрыёта, адважнага партызана і лекара, вырашылі на месцы Пузічскага касцёла Святой Ганны, знішчанага ў гады вайны фашыстамі, дзе працаваў Францішак Кубш, стварыць мемарыяльную зону з помнікам, альбо памятным знакам, прысвечаным гэтаму польскаму патрыёту. Улічваючы, што побач у в. Хорастава працуе музей “Партызанскай Славы імя В.З. Каржа” само сабой напрашваецца ўвесці ў экспазіцыю музея матэрыялы і экспанаты аб Францішку Кубшу, прысланыя з Польшчы [13, с. 4].

Няма сумненняў, што ажыццяўленне гэтых задумак з’явіцца тым накірункам, які павысіць патрыятычнае і духоўнае выхаванне моладзі. З мэтай увекавечвання памяці славутага польскага святара, думаем патрэбна было б адной з вуліц Пінска, Лунінца альбо Салігорска надаць назву імя Францішка Кубша, што пасадзейнічае пабрацімству нашых раённых цэнтраў з польскімі горадамі, якія ўшаноўваюць памяць аб славутым польскім ксяндзы, а гэта, несумненна, прывядзе да актывізацыі турызму.

ПолесГУ

# ЗАКЛЮЧЭННЕ

Зместам дадзенай працы з’яўляецца жыццяпіс дзейнасці славутага польскага ксяндза, нацыянальнага героя Польшчы Францішка Кубша падчас яго знаходжання на зямлі беларускага Палесся (жнівень 1939 – май 1943).

У выніку даследавання зроблены наступныя высновы:

1. З пачатку жніўня 1939 г., распачаўшы місіянерскую дзейнасць на пасадзе вікарыя парафіі касцёла Праабражэння Гасподняга ў палескай вёсцы Лунін, Францішак Кубш, з’яднаўшы вакол сябе паству, змог усталяваць добрыя ўзаемаадносіны не толькі з калегамі – беларускімі ксяндзамі, але і з праваслаўнымі святарамі. Набыў асаблівы давер сярод пераважаючага колькасна на Піншчыне праваслаўнага насельніцтва тым, што не пераманьваў іх у каталіцтва, а сам вёў набажэнства на беларускай мове, дапамагаў як дзецям з каталіцкіх, так і з праваслаўных сем’яў набыць пісьменнасць, усім даваў добрыя, мудрыя парады.

2. У няпростым становішчы аказаліся польскія ксяндзы пасля змены ўлады 17 верасня 1939 г. Ва ўмовах камуністычнай прапаганды атэізму, і нягледзячы, што польскія ўлады пакінулі сярод беларусаў-палешукоў не лепшую пра сябе памяць, малады святар настолькі добра спраўляўся са сваімі абавязкамі, што яго парафія колькасна павялічылася.

3. Францішак Кубш праводзіць істотную лячэбна-агітацыйную работу сярод мясцовага насельніцтва, якая прыводзіць да выздараўлення людзей, зрываючы планы нямецка-фашысцкага камандавання па адпраўцы моладзі на прымусовыя работы ў Германію, і тым самым садзейнічае значнаму колькаснаму папаўненню партызанскіх атрадаў на Піншчыне.

4. Нягледзячы на ўсе складаннасці і цяжкасці, выпаўшыя на долю Францішка Кубша, у ваенны час ён не страціў веру ў людзей, што дапамагло яму стаць актыўным змагаром супраць германскага нацызму ў шэрагах Пінскага партызанскага злучэння. Ён аказваў сістэматычную



Полесгу

медыцынскую дапамогу параненным партызанам, удзельнічаў ў шматлікіх баявых аперацыях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў, праяўляючы мужнасць і гераізм. З цягам часу стаў ўсеагульным улюбёнцам партызан і лепшым сябрам камандзіра Пінскага партызанскага злучэння Васіля Захаравіча Каржа.

5. У сярэдзіне 1943 г. па рэкамендацыі кіраўніцтва Пінскага партызанскага злучэння Францішак Кубш накіроўваецца ў Маскву для стварэння польскіх вайсковых фарміраванняў. Разам з Зігмундам Берлінгам і Вандай Васілеўскай Кубш удзельнічае у стварэнні польскай брыгады імя Тадэвуша Касцюшкі і жаночага батальёна імя Эміліі Плятэр. Па загаду савецкага галоўнакамандуючага Іосіфа Сталіна Кубш уводзіцца ў кіраўніцтва органаў будучай вызваленай Польшчы – Нацыянага Камітэта Свабоднай Польшчы (НКСП). У рангу капелана Войска Польскага ён удзельнічае ў вызваленні Беларусі і Польшчы.

6. Францішак Кубш заўсёды помніў пра палескі край, аб чым сведчаць шматлікія яго ўспаміны і запісы, а памяць аб ім жыве на Палессі. У вёсцы Пузічы, на месцы спаленага фашыстамі касцёла Святой Ганны, дзе праводзіў набажэнствы ксёндз, мяркуецца паставіць памятны знак, а ў вёсцы Хорастава ў экспазіцыі музея Партызанскай Славы імя В.З. Каржа будзе прадстаўлены матэрыял, прысвечаны польскаму святару.

Полесу

# СПІС ВЫКАРЫСТАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ


1. Połturzycki, B. Legendarny kapelan Kubsz / B. Połturzycki // Serwis wodzisławski. – 1996. – 17 lipca.
2. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). Фонд. 4 п. – Воп. 21.– С.1521.– Л.21.
3. Zieliński, Ze wshodu z kapelanem / S.Zieliński // Warszawa : Wydawnictwo Vipart, 1997. – 160s.
4. Ясько, А.Ф. Больно даже мёртвым : Полесская трагедия / А.Ф. Ясько.– Минск : Бонем, 2012 – 400 с.
5. Auderska, H. “Ptasi gościniec” / H. Auderska : Warszawa, 1973. – s. 181–186.
6. Цуба, М.В. Жыццё і подзвіг братоў Цубаў / М.В. Цуба.– Пінск : ПалесДУ, 2013 – 73 с.
7. Berling, Z. Nasze spotkania i rozstania / Z. Berling // Warszawa : Wydawnictwo Vipart, 1991. – 295 s.
8. Национальный архив Республики Беларусь. Фонд. 3 500. – Воп. 4. – С. 277. – Л. 30.
9. Цуба, М. Служыў Богу і Радзіме / М. Цуба // Звязда.– 2014. – 23 ліпеня.
10. Книга “Военные воспоминания ксендзов-капелланов 1939–1945”, Варшава, 1967.
11. Цуба, М. З крыжам і аўтаматам / М. Цуба // Заря. – 2014. – 5 июня.
12. Hubert, H., Lenina H. Opowiese o bitwe / H. Hubert, H. Lenina // Warszawa : WMON, 1959. – C.56.
13. Канюта, В. Палескі край памятае Кубша / В. Канюта // Звязда. – 2014. – 24 верасня.


ПолесГУ

*Навукова-папулярнае выданне*

**Цуба Міхаіл Віктаравіч**

# У ГАДЫ ВАЙНЫ ЯГО ЛЁС БЫЎ ЗВЯЗАНЫ З ПАЛЕССЕМ

Адказны за выпуск *П.Б. Пігаль*

У аўтарскай рэдакцыі

Карэктар *К.М. Міцянок*

Падпісана ў друк 01.02.2018 г. Фармат 60×84/16.
Папера афсетная. Гарнітура «Таймс». Рызаграфія.
Ум.-друк. арк. 1,67. Ул.-выд. арк. 1, 12.
Тыраж 70 экз. Заказ № 473

Надрукавана ў рэдакцыйна-выдавецкім аддзеле
Палескага дзяржаўнага ўніверсітэта.
225710, г. Пінск, вул. Дняпроўскай флатыліі, 23.

ПолесГУ